*Да 70-годдзя Вялікай Перамогі*

# А.І.АНТОНАЎ.
# Яго імем названа вуліца ў горадзе Гродна

Аляксей Інакенцьевіч Антонаў нарадзіўся 15 (28) верасня 1896 года ў горадзе Гродна ў сям'і афіцэра 26-й артылерыйскай брыгады. Бацька – Інакенцій Аляксеевіч (пам. у 1908 г.). Маці – Тэрэза Ксавер'еўна (пам. у 1915 г.). Сям'я Антонава была звычайнай сям'ёй камандзіра батарэі з невялікім прыбыткам. У 1915 годзе Аляксей паступіў у Пецярбургскі ўніверсітэт, але неўзабаве з-за матэрыяльных цяжкасцей быў вымушаны перапыніць вучобу і пайсці працаваць на завод. У 1916 годзе Аляксея Антонава прызываюць у войска і накіроўваюць у Паўлаўскую вайсковую вучэбную ўстанову. Па заканчэнні курса навучання маладога прапаршчыка прызначаюць у лейб-гвардыі егерскі полк. Удзельнічаючы ў баях на палях Першай сусветнай вайны, малады афіцэр Антонаў быў паранены, за праяўленую мужнасць быў узнагароджаны ордэнам Святой Ганны IV ступені з надпісам «За адвагу». Пасля выздараўлення салдаты абіраюць яго памочнікам палкавога ад'ютанта.

У маі 1918 года прапаршчык Антонаў быў звольнены ў запас. Вучыўся на вячэрніх курсах Ляснога інстытута, працаваў у харчовым камітэце Петраграда, а ў красавіку 1919 года быў прызваны ў РСЧА. З гэтага моманту Аляксей Інакенцьевіч прысвяціў усё сваё жыццё служэнню Радзіме ў шэрагах яе Узброеных Сіл. Службу пачаў на пасадзе памочніка начальніка штаба 1-й Маскоўскай рабочай дывізіі, ваяваў на Паўднёвым фронце. Пасля цяжкіх баёў у чэрвені 1919 года рэшткі гэтага вайсковага злучэння былі перададзены ў склад 15-й Інзенскай стралковай дывізіі. У ёй А.І. Антонаў праслужыў да жніўня 1928 года, займаючы розныя штабныя пасады. За актыўны ўдзел у фарсіраванні возера Сіваш ён быў узнагароджаны ганаровай зброяй Рэвалюцыйнага ваеннага савета рэспублікі, а ў 1923 годзе яму была ўручана ганаровая грамата. У 1928 годзе малады камандзір паступае ў Акадэмію імя М.В. Фрунзе, пасля заканчэння якой яго прызначаюць начальнікам штаба 46-й стралковай дывізіі ў горадзе Карасцень. У 1933 годзе ён скончыў аператыўны факультэт гэтай жа акадэміі і быў накіраваны на ранейшую пасаду. У кастрычніку 1934 года А.І. Антонаў стаў начальнікам штаба Магілёва-

Ямпольскага ўмацаванага раёна, а ў жніўні 1935 года – начальнікам аператыўнага аддзела штаба Харкаўскай ваеннай акругі. У кастрычніку 1936 года адкрываецца Акадэмія Генеральнага штаба РККА. У ліку першых слухачоў гэтай навучальнай установы былі таксама Аляксандр Васілеўскі, Леанід Говараў, Іван Баграмян, Мікалай Ватуцін. У Акадэміі Генштаба Антонаў паспяхова правучыўся толькі першы курс, таму што ў чэрвені 1937 года яго выклікаў Варашылаў і прызначыў на пасаду начальніка штаба Маскоўскай ваеннай акругі, камандуючым якой быў Маршал Савецкага Саюза С.М. Будзённы. Пад канец 1938 года А.І. Антонаў займае пасаду старшага выкладчыка, а праз некаторы час – пасаду намесніка начальніка кафедры агульнай тактыкі Ваеннай акадэміі імя М.В. Фрунзе. У лютым 1940 года яму прысвоена вучонае званне дацэнта, а ў чэрвені гэтага ж года – воінскае званне генерал-маёра. У сакавіку 1941 года А.І. Антонаў прызначаецца на пасаду намесніка начальніка штаба Кіеўскай асобай ваеннай акругі. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. У жніўні 1941 года генерал-маёр А.І. Антонаў знаходзіўся на пасадзе начальніка штаба Паўднёвага фронту. Да гэтага часу войскі фронту вялі напружаныя абарончыя баі. У ходзе баёў штабам Паўднёвага фронту была падрыхтавана і ў лістападзе праведзена Растоўская наступальная аперацыя, у выніку якой была разгромлена 1-я нямецкая танкавая армія, быў вызвалены Растоў-на-Доне, а праціўнік адкінуты ад гэтага горада на 60 – 80 кіламетраў. За паспяховыя дзеянні ў Растоўскай аперацыі А.І. Антонаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, яму было прысвоена воінскае званне генерал-лейтэнанта. З ліпеня 1942 года Аляксей Інакенцьевіч паслядоўна ўзначальваў штабы Паўночна-Каўказскага фронту, Чарнаморскай групы войскаў і Закаўказскага фронту. Войскі гэтых франтоў, праявіўшы выключную стойкасць, спынілі ворага, не далі яму авалодаць Чарнаморскім узбярэжжам і прарвацца ў Закаўказзе. За ўмелае камандаванне войскамі генерал-лейтэнант А.І. Антонаў быў узнагароджаны другім ордэнам Чырвонага Сцяга.

У снежні 1942 года загадам Стаўкі Вярхоўнага Камандавання Аляксей Інакенцьевіч прызначаецца першым намеснікам начальніка Генеральнага штаба і начальнікам Аператыўнага ўпраўлення. З гэтага часу пачалася актыўная праца А. І. Антонава ў вышэйшым органе ўпраўлення Чырвонай Арміі.



Праца ў Генеральным штабе складаная і шматгранная. У функцыі А. Антонава ўваходзілі збор і апрацоўка аператыўна-стратэгічнай інфармацыі аб становішчы, якое складвалася на франтах, падрыхтоўка аператыўных разлікаў і прапаноў па выкарыстанні Узброеных сіл, непасрэдная распрацоўка планаў ваенных кампаній і стратэгічных аперацый на тэатрах ваенных дзеянняў. На аснове рашэнняў Стаўкі і Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Генеральны штаб рыхтаваў дырэктывы камандуючым франтамі, флатамі, відамі Узброеных сіл і іх штабамі, рыхтаваў загады народнага камісара абароны, ажыццяўляў кантроль за іх выкананнем, сачыў за падрыхтоўкай стратэгічных рэзерваў і іх правільным выкарыстаннем.

На Генеральны штаб таксама была ўскладзена задача абагульнення перадавога баявога вопыту аб'яднанняў, злучэнняў і часцей. Генштаб

распрацоўваў найважнейшыя палажэнні ў галіне ваеннай тэорыі, рыхтаваў прапановы і заяўкі на вытворчасць ваеннай тэхнікі і ўзбраення. Ён з'яўляўся таксама адказным за каардынацыю баявых дзеянняў партызанскіх фарміраванняў са злучэннямі Чырвонай Арміі.

У студзені 1943 года генерал А.І. Антонаў у якасці прадстаўніка Стаўкі быў накіраваны на Бранскі, а затым на Варонежскі і Цэнтральны франты. Варонежска-Касторненская аперацыя, падчас якой Аляксей Інакенцьевіч займаўся каардынацыяй дзеянняў войскаў, была паспяхова завершана. Былі вызвалены гарады Варонеж і Курск. Па прадстаўленні А.М. Васілеўскага генерал-лейтэнант А.І. Антонаў быў узнагароджаны ордэнам Суворава І ступені. Па заканчэнні гэтай камандзіроўкі Аляксей Інакенцьевіч стаў бываць у Стаўцы па шмат разоў на дзень. Ён старанна аналізаваў інфармацыю з франтоў, заслухоўваў многіх генералаў і афіцэраў, узгадняў найбольш важныя пытанні з камандаваннем франтоў і дакладваў прапановы Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму. У красавіку 1943 года А.І. Антонаву прысвойваецца воінскае званне генерал-палкоўніка, а ў маі ён вызваляецца ад абавязкаў начальніка Аператыўнага ўпраўлення, застаючыся першым намеснікам начальніка Генеральнага штаба.

Першай вялікай стратэгічнай аперацыяй, у планаванні якой А.І. Антонаў прымаў непасрэдны ўдзел, была Курская бітва. За арганізацыю і падрыхтоўку гэтай бітвы ён быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І-й ступені. Падрыхтоўцы праціўнікам магутнага наступлення на Курскай дузе савецкае Вярхоўнае Галоўнае камандаванне вырашыла супрацьпаставіць глыбока эшаланіраваную, непераадольную абарону, абяскроўліванне нямецкіх войскаў, каб затым контрнаступленнем завяршыць іх разгром.У выніку Чырвоная Армія нанесла фашыстам такое паражэнне, ад якога фашысцкая Германія ўжо не змагла адысці. Была створана трывалая аснова для правядзення шырокіх наступальных аперацый па ўсім фронце ў мэтах поўнага выгнання ворага з савецкай тэрыторыі. За бліскуча спланаваную і паспяхова праведзеную аперацыю на Курскай дузе ў жніўні 1943 года  А.І. Антонаву было прысвоена воінскае званне генерала арміі.

Важнай вехай у жыцці Аляксея Інакенцьевіча стала Беларуская аперацыя. У ходзе яе падрыхтоўкі і правядзення ў поўнай меры раскрыліся яго выдатныя арганізатарскія і стратэгічныя здольнасці. 20 мая 1944 года генерал прадставіў на разгляд Стаўкі план гэтай аперацыі,

якая атрымала кодавую назву «Баграціён». Была праведзена велізарная праца па скрытай канцэнтрацыі войска і баявой тэхнікі, дэзінфармацыі праціўніка.  Гэтая наступальная аперацыя з'явілася поўнай нечаканасцю для гітлераўскіх войскаў. У выніку магутных udараў чатырох франтоў савецкія войскі разграмілі групу армій «Цэнтр»,  вызвалілі Беларусь, частку Літвы і Латвіі, увайшлі на тэрыторыю Польшчы і падышлі да межаў Усходняй Прусіі, прасунуўшыся на 550 – 600 кіламетраў і пашырыўшы фронт наступлення больш чым на 1000 кіламетраў. За арганізацыю і правядзенне гэтай аперацыі Аляксей Інакенцьевіч зноў быў узнагароджаны ордэнам Суворава I ступені.

Пасля Беларускай аперацыі сталі яшчэ больш моцнымі ўзаемаадносіны А.І. Антонова з Вярхоўным Галоўнакамандуючым. Менавіта ў гэты перыяд І.В. Сталін усё часцей і часцей даручае Аляксею Інакенцьевічу адказныя заданні, уважліва выслухоўвае яго, асабліва па аператыўных пытаннях. Значна часцей Вярхоўны Галоўнакамандуючы пачаў звяртацца да яго і па пытаннях узаемаадносін з саюзнікамі. Вядомы авіяканструктар  А.С. Якаўлеў пісаў: «Антонаў быў вельмі блізкі да Сталіна, які лічыўся з яго меркаваннем, меў да яго відавочную сімпатыю і давер, праводзіў з ім доўгія гадзіны, абмяркоўваў становішча на франтах і планаваў будучыя аперацыі». Камандуючыя войскамі, якія прыязджалі ў Стаўку, перш чым ісці да Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, ішлі да А.І. Антонава і раіліся з ім па сваіх планах і ўсіх пытаннях падрыхтоўкі баявых дзеянняў. Прадстаўнікі Стаўкі, накіроўваючы свае даклады І.В. Сталіну, абавязкова адрасоўвалі іх копіі «таварышу Антонаву», ведаючы, што генерал зробіць усё неабходнае дакладна і ў тэрмін.

У другой палове 1944 года стала ясна, што менавіта А.І. Антонаву будзе даручана ўзначаліць групу савецкіх ваенных экспертаў на маючай адбыцца канферэнцыі кіраўнікоў трох дзяржаў. Крымская канферэнцыя пачала сваю працу 4 лютага 1945 года з абмеркавання ваенных пытанняў. Кіраўнікі ўрадаў СССР,  ЗША і Вялікабрытаніі разгледзелі становішча на еўрапейскіхфрантах. Даклад аб становішчы на савецка-германскім фронце зрабіў генерал арміі А.І. Антонаў. У ходзе перагавораў на яго быў ускладзены абавязак каардынаваць дзеянні стратэгічнай авіяцыі саюзнікаў.

У лютым 1945 года Аляксей Інакенцьевіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Прадстаўляючы яго да гэтай узнагароды, Маршал Савецкага

Саюза А.М. Васілеўскі пісаў: «Генерал арміі Антонаў А.І., будучы першым намеснікам начальніка Генштаба, фактычна з вясны 1943 года нясе на сабе ўвесь цяжар працы Генштаба пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнага камандавання і цалкам з ёю спраўляецца. Выдатна кіруе працай усяго Цэнтральнага апарата НКА».

Пасля гібелі І.Д. Чарняхоўскага камандуючым 3-м Беларускім фронтам быў прызначаны А.М. Васілеўскі, а А.І. Антонаў стаў начальнікам Генеральнага штаба Чырвонай Арміі.  Адначасова ён быў уключаны ў склад Стаўкі ВГК.

Карта Берліна і прылягаючых да яго раёнаў з'явілася на стале ў Аляксея Інакенцьевіч летам 1944 года ў перыяд правядзення Беларускай аперацыі. А 1 красавіка 1945 года ў Стаўцы быў заслуханы яго даклад аб агульным плане Берлінскай аперацыі. За дзесяць дзён савецкія войскі акружылі Берлінскую групоўку праціўніка і злучыліся на рацэ Эльба з войскамі саюзнікаў. 8 мая 1945 года Германія падпісала акт аб безагаворачнай капітуляцыі, а праз некалькі дзён савецкія войскі разграмілі групоўку нямецка-фашысцкай арміі ў Чэхаславакіі. 4 чэрвеня 1945 года «за ўмелае выкананне заданняў Вярхоўнага Галоўнакамандавання ў справе правядзення баявых аперацый вялікага маштабу» генерал арміі А.І. Антонаў быў узнагароджаны вышэйшым вайсковым ордэнам Перамогі.

У пачатку чэрвеня 1945 года Генеральны штаб пад кіраўніцтвам А.І. Антонава разам з А.М. Васілеўскім завяршыў распрацоўку плана вайны з Японіяй. На Патсдамскай канферэнцыі генерал праінфармаваў аб гэтым ваенных прадстаўнікоў ЗША і Вялікабрытаніі. 7 жніўня І.В. Сталін і А.І. Антонаў падпісалі загад аб пачатку баявых дзеянняў супраць Японіі з раніцы 9 жніўня. У цяжкіх умовах гэтага тэатра вайны Чырвоная Армія нанесла сакрушальны ўдар па японскіх  узброеных сілах. Савецкімі войскамі былі цалкам вызвалены Маньчжурыя,  Ляадунскі паўвостраў, Паўночная Карэя, паўднёвая частка вострава Сахалін і Курыльскія астравы.

Адразу ж пасля заканчэння вайны ў Еўропе Генеральны штаб заняўся распрацоўкай плана дэмабілізацыі воінаў старэйшых узростаў з войска і флоту і найхутчэйшага вяртання іх дадому, уключэння ў дзейнасць па аднаўленні краіны. На працягу 1945 года былі расфарміраваны ўсе

франты і многія арміі, карпусы і асобныя вайсковыя часці, скарочана колькасць ваенна-навучальных устаноў.

У сакавіку 1946 года Маршал Савецкага Саюза А.М. Васілеўскі зноў заняў пасаду начальніка Генеральнага штаба, а генерал арміі А.І. Антонаў стаў яго першым намеснікам. Менавіта на яго была ўскладзена ўся адказнасць за выкананне Закона аб дэмабілізацыі і правядзенне шэрагу іншых арганізацыйных мерапрыемстваў. На працягу 1945-1948 гадоў было дэмабілізавана больш за 8 мільёнаў чалавек, кадравыя войскі арганізацыйна былі зведзены ў ваенныя акругі. Пад канец 1948 года генерал А. Антонаў прызначаецца першым намеснікам, а з 1950 года – камандуючым войскамі Закаўказскай ваеннай акругі. Цяпер у аснове жыцця і дзейнасці войскаў ляжала ўжо баявая падрыхтоўка ва ўмовах мірнага часу, якая патрабавала займацца пытаннямі падрыхтоўкі камандзіраў і штабоў тактычнага і аператыўнага звенняў, вывучэння новай ваеннай тэхнікі і ўзбраення. Увосень 1953 года ў Закаўказскай ваеннай акрузе пад кіраўніцтвам генерала арміі А.І. Антонава былі праведзены буйныя манеўры, на якіх асабовы склад праявіў выключную фізічную падрыхтоўку, маральную вытрымку і вайсковае майстэрства.

У 1949 годзе быў створаны ваенна-палітычны блок НАТА. Пачалася так званая «халодная вайна». У адказ 14 мая 1955 года Савецкі Саюз і яго саюзнікі падпісалі ў Варшаве Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ваеннай дапамозе. За год да стварэння арганізацыі Варшаўскага Дагавора генерал арміі А.І. Антонаў зноў быў прызначаны першым намеснікам начальніка Генеральнага штаба і членам калегіі Міністэрства абароны СССР. А з падпісаннем Варшаўскага Дагавора ён быў абраны Генеральным сакратаром Палітычнага кансультатыўнага камітэта і прызначаны начальнікам штаба Аб’яднаных узброеных сіл. Знаходзячыся на гэтай пасадзе, Аляксей Інакенцьевіч шмат часу адводзіў распрацоўцы пытанняў аператыўнага, арганізацыйнага і ваенна-навуковага характару, правядзенню мерапрыемстваў па тэхнічным аснашчэнні войскаў, іх баявой і аператыўнай падрыхтоўцы. У кароткі тэрмін быў наладжаны апарат упраўлення для армій краін Варшаўскага Дагавора, арганізавана навучанне войскаў сумесным дзеянням у сучаснай вайне. Нястомны начальнік штаба Аб’яднаных узброеных сіл асабіста ўдзельнічаў у шматлікіх вучэннях войскаў саюзных краін, дапамагаючы нашым сябрам і дзелячыся з імі сваім неацэнным вопытам.

З 1946 года на працягу 16 гадоў А.І. Антонаў быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Ён часта сустракаўся са сваімі выбаршчыкамі, чула ставіўся да іх запытаў, прапаноў і просьбаў.

Аляксей Інакенцьевіч любіў сям'ю, з глыбокай павагай ставіўся да памяці бацькі і маці. Чытанне, тэатр, шахматы, фатаграфія, лыжы, веславанне, валейбол, прагулкі ў лесе і падарожжа былі яго любімымі заняткамі і адпачынкам. Будучы акуратным, ведаючы цану часу, ён патрабаваў гэтага і ад іншых. Любіў людзей прамых, адкрытых, вышэй за ўсё цаніў у іх самастойнасць, адданасць сваёй справе. Яго заўсёды абуралі грубасць, нядобрасумленнасць, хлусня, непавага да чалавечай годнасці. Кароткую, але ў той жа час ёмістую і высокую ацэнку Антонаву даў Маршал Савецкага Саюза Г.К. Жукаў: «Аляксей Інакенцьевіч быў у вышэйшай ступені пісьменны ваенны, чалавек вялікай культуры і прывабнасці». А.І Антонаў памёр на службе ў росквіце творчых сіл ва ўзросце 65 гадоў. Здарылася гэта 18 чэрвеня 1962 года. Пахаваны ён на Чырвонай плошчы ў Маскве.

Імя военачальніка прысвоена Ленінградскаму вышэйшайму ваенна-тапаграфічнаму каманднаму вучылішчу і сярэдняй школе № 11 у г. Гродна.

Будынак, дзе жыў А.І. Антонаў, падчас рэканструкыі згарэў, на яго месцы пабудавалі новы.У ім зараз размяшчаецца фірменны магазін па продажы і абслугоўвнні аператараў мабільнай сувязі «Velkom».У 2004 годзе на сцяне галоўнага фасада дома рэдакцыі «Гродзенская праўда» была ўстаноўлена новая мемарыяльная дошка памяці нашага земляка генерала арміі А.І. Антонава.

БРАНІСЛАЎ ЕРМАШКЕВІЧ





1. Алексей Иннокентьевич Антонов – биография [Электронный ресурс] /А.И. Антонов// Режим доступа: https://yandex.by/yandsearch?rdrnd=427260&text= (20.12.2014);

2.Гаглов И.И. Генерал армии А.И. Антонов/ И.И.Гаглов. – Москва: Воениздат, 1987. — 165с.;

3.Гродно: энциклопедический справочник / Гл.ред. И.П. Шамякин и др. – Минск : Белорусская Советская Энциклопедия, 1989. С.82-83;

4.Карта-план города Гродно – М.1:20 000 – Белкартография 2014;

5.Штеменко С. Генерал армии А.Антонов / С.Штеменко// Полководцы и военачальники Великой Отечественной: сб-к. 2 изд. — Москва: Молодая гвардия, 1979.– 445с.